5. Бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапанавалі ўсім партыйным, савецкім і камсамольскім арганізацыям Беларусі, улічыўшы ўрокі справы тав. Сьцяпуры, зрабіць усе выгады ў сваёй рабоце па правільным акцыцыўленьні нацыянальнай палітыкі партыі, разгорнуўшы сапраўдную бальшавіцкую барацьбу за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму, супроць ухілаў вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, і супроць мясцовых шавінізмаў.

### II

Бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР паведамляюць, што факты, апублікаваныя ў «Правде» ад 2 сакавіка г. г. аб засьмечанасьці апарату Наркамасьветы клясава-чужымі элементамі, поўнасьцю пацьвердзіліся.

Кіраўніцтва Наркамасьветы БССР дапусьціла рад палітычных прарываў у рабоце органаў асьветы: не забясьпечыла правядзеньня дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб рабоце масавай і вышэйшай школы, палітэхнізацыі школ, і ў радзе выпадкаў дапусьціла зрыў палітэхнізацыі і скажэньні клясавай лініі ў праграмах, не вяло барацьбы за ачышчэньне апарату Наркамасьветы як у цэнтры, так і на мясцох, ад клясава-чужых, нацдэмаўскіх, бундаўскіх, сіяніцкіх элементаў, праяўляючы да іх ціла-лібэральныя адносіны.

Кіраўніцтва Наркамасьветы не вяло бальшавіцкай барацьбы за асноўныя прынцыпы пралетарскага інтэрнацыяналізму ў пытаньнях нацыянальнай палітыкі, а ў радзе выпадкаў патурала буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям, праводзячы мэханічна нацыянальную палітыку партыі.

Бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР, разгледзеўшы ўсе гэтыя факты, а таксама факты, паведамленыя ў «Правде», — за скажэньне нацыянальнай палітыкі партыі і незабясьпячэньне бальшавіцкага кіраўніцтва работы Наркамасьветы наркому асьветы БССР тав. **Платуну** абвясьцілі вымову з вызваленьнем ад работы наркома: намесьніку наркома тав. **Вальфсону** абвешчана вымова са зьняцьцем з работы; нам. наркома т. т. **Бялузе і Рудніцкаму** абвешчаны вымовы з папраджаньнем. Усе члены калегіі Наркамасьветы папраджаны, што яны абязаны сапраўды па-бальшавіцку разгарнуць барацьбу за ачыстку апарату і органаў Наркамасьветы од клясава-чужых нацыяналістычных элементаў, перабудаваўшы работу апарату Наркамасьветы і яго органаў на мясцох у адпаведнасьці з дырэктывамі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР паведамляюць «Правде», што спэцыяльнай камісіяй НК РСІ пераглядзен склад работнікаў Наркамасьветы і праводзіцца ачыстка апарату ад клясава-чужых, антысавецкіх элементаў (нацдэмы, эсэры, кулацкія элементы і г. д.).

### III

Бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР паведамляюць, што апрача адзначаных вышэй фактаў скажэньня нацыянальнай палітыкі партыі ў Беларусі, бюро ЦК і прэзыдыумам ЦКК разгледжаны факты скажэньня нацыянальнай палітыкі партыі ў Негарэльскай мытніцы, дзе група работнікаў мытніцы павяла актыўнае цкаваньне і дыскрэдытацыю кіраўніка мытніцы тав. **Бабаяна**, выкоўваючы сугрэць тав. Бабаяна ліквіды абвінавачаньні ў вялікадзяржаўным шавінізьме.

Бюро Дзяржынскага РК КП(б)Б, замест падтрыманьня тав. Бабаяна ў яго барацьбе з буржуазна-нацыяналістычнымі элементамі, якія разложыліся, стала на шлях фактычнага іх падтрыманьня, а таксама ліквідавала абвінавачаньня тав. Бабаяна ў вялікадзяржаўным шавінізьме.

Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК КП(б)Б па гэтых фактах скажэньня нацыянальнай палітыкі партыі прынялі наступныя меры:

1. Скасавалі пастанову бюро Дзяржынскага РК КП(б)Б па абвінавачаньні тав. Бабаяна ў вялікадзяржаўным шавінізьме.

2. Абвешчана суровая вымова ўсяму складу райкому партыі, а сакратару райкому тав. **Пушчыну** абвешчана суровая вымова са зьняцьцем з работы.

3. Старшыня РККРСІ Дзяржынскага раёну тав. **Ілмірскі**, які не забясьпечыў неабходнага падтрыманьня і дапамогі тав. Бабаяну, зьнят з работы і яму забаронена ў далейшым працаваць у кантрольных партыйных органах.

4. Абвешчана суровая вымова начальніку беларускага адзяленьня Галоўнага мытнага кіраўніцтва тав. **Мартынаву** і зьнят з работы рэдактар газэты «Орка» тав. **Прынц**, які зьмясьціў артыкул з ілжывым абвінавачаньнем тав. Бабаяна ў вялікадзяржаўным шавінізьме.

Бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР паведамляюць, што ў сувязі з пералічанымі вышэй фактамі скажэньня ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР і наўмысную раду фактаў патурання буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям як з боку партыйных і савецкіх арганізацый, так і пасобных работнікаў, склікаецца на 12 сакавіка аб'яднаны пленум ЦК КП(б)Б і Менскага гаркому для мабілізацыі ўсёй КП(б)Б на барацьбу за асноўныя прынцыпы пралетарскага інтэрнацыяналізму і пырокага абгаварэньня ўсіх выяўленых фактаў скажэньня нацыянальнай палітыкі партыі ў БССР.

Бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР цьвёрда ўпэўнены, што на аснове адкрытай бальшавіцкай крытыкі ўсіх памылак беларускіх партыйных і савецкіх арганізацый у правядзеньні нацыянальнай палітыкі, бальшавікі Беларусі дабіўцца новых поспехаў у справе будаўніцтва культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу.

**Бюро ЦК КП(б)Б.**
**СНК БССР.**

## АЧЫСЬЦІЦЬ КАЛГАС „БАЛЬШАВІК"

Калгас **«Бальшавік», Крываносаўскага сельсавету, Стара-Дароскага раёну**, разбураецца пралезнымі тушыкуланамі.

Вось букет гэтых клясава-варожых людзей: **Дзем'янсеіч**—былы экспаніт маёнтку барона Врангеля, **Яськін**—сын былога жандара, **Вусін Сьцяпан**—раскулачаны, **Усеня П.**—сын кулака, **Аляксандраў**—кулак, **Сакалоўская Зося**—з сям'і раскулачанага і высланага, **Рагазінчыкова**—жонка былога дваранта і чыноўніка. Некаторыя з пералічаных зьяўляюцца членамі праўленьня і рэвкамісіі. Кулак Аляксандраў—загадчык млыну, Усеня П.—клапаўшчык і г. д.

Уся гэта зграя на працягу доўгага часу вядзе контр-рэвалюцыйную, вярэдніцкую работу. Калгасная маемасьць расьцягваецца, наўмысьля зьнішчаецца ўраджайнасьць. Зямля апрацоўвалася па-шкодніцку. Напрыклад, пасеў аўса і прочкі рабіўся без баранаваньня пад пружыноўку. Бульба садзілася ў адзавор, без гною. Пустазельле ня зьнішчалася. Па радзе культур пасеў загінуў.

Калгас заданьні па загатоўках ня выканаў, а сельска-гаспадарчыя прадукты разбазарваліся. Яшчэ да 1-га ступеня прадана збожжа на прыватным рынку 6.994 кгр., бульбы—450 пудоў. Кармы разбазараны, а калгас нае стада галадае.

Арганізацыя працы ў калгасе пастаўлена зусім дрэнна. Большасьць работ выконвалася найнізкай рабочай сілай. Расцінта праводзілася нагурай. Працадні налічваліся бо норм выпрацоўкі, без дакладнага ўліку, зьдзелічына ня ўжывалася. З 11.909 працадзён 4576 прыходзе адміністрацыйна-тэхнічнаму персаналу.

Старшынёй калгасу **Какатуном** і членам праўленьня **Сінягубам** праведзена за 1932 г. 18 коней, а выдучныя тропы пранізаліся. Разваліваецца сьвінафэрма. Са 156 шт. сьвіней засталося толькі 61 шт. Вялікі падсек. Шмат сьвіней проста разабрана на руках.

З 57 кароў разбазарана 24. На фэрме засталося 14 штук. Куды дзеліся 8 кароў—зусім невядома.

Плян сілазаваньня ў калгасе сарваны. Замест 400 тон заціласавана толькі 20. Але і гэта ніяк ня ўмеюць. Гэтаму «дапамог» брыгадзір Сінягуб.

Гэтыя агідныя справы сьвяцяцца вынікам таго, што сельсавет, парт'ячэйка, райземаддзел не кіравалі калгасам, шкодзілі ліквідыя зводзі, шкамавалі шкодніцтва.

Былі ў калгасе і работнікі райкому і РВК, але яны таксама нічога не заўважылі. Больш таго, у раёне былі спробы прыняты ў калгас раней вычышчаныя кулакі і паменшыкі — Бялоў, Кубрык, Беразоўскі Ф., Цалой ка Якуб.

Калгас «Бальшавік», на жаль, не выяўляецца выключэньнем у Стара-Дароскім раёне. Спрата рэвалюцыйнай настарожанасьці з боку раду пізаных і раённых работнікаў дала магчымасьць клясаваму ворагу арудаваць і ў радзе іншых калгасаў, як напрыклад, «Прагрэс», «Чырвоная ручэй», «РЭС», «Камуна» і інш.

Сыгналы аб даным становішчы, што былі ў «Зьвязьдзе» ў лістападзе мінулага году, засталіся ў раёне непачутымі.

Час пакласьці канец шкодніцкай дзейнасьці клясавага ворага.

**А. Граза.**

**АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» спадзяецца, што ЦКК КП(б)Б займецца справай калгасу «Бальшавік» і высьвятліць ролю ў ёй стара-дароскіх раённых арганізацый.**

# АБ СТАНОВІШЧЫ ВПІ

## *Пастанова сакратарыяту ГК КП(б)Б*

Разгледзеўшы матар'ялы камісіі ГК КП(б)Б па пытаньні становішча работы Вышэйшага педагагічнага інстытуту, сакратарыят ГК КП(б)Б пастанаўляе:

а) Лічыць устаноўленым, што бюро партколектыву і кіраўніцтва інстытуту страцілі клясавую пільнасьць, дапусьцілі сілы лібэралізм да клясававорожых выпадкаў і асоб, якія вядуць антысавецкую работу, прыкрываючыся фальшыва-нацыянальным сьцягам на ідэалёгічным фронце. Яркім паказальнікам гэтага зьяўляецца перэтаваньне на справу Кернажыцкага і Гесона, сыстэматычнае працягваньне ў ВПІ контр-рэвалюцыйных, трацкісцкіх ідэй (справа Рыўліна, Айзэнберга, справа дацэнта Стальнога і асыстэнта Марголінай; антыленінскае выкладаньне гісторыі народаў СССР, БССР і старажытнай гісторыі (асноўныя напрачлікі Нічэты, Ігнатоўскага, Любаўскага, Віпера і інш.), перэтаваньне на актывізацыю клясава-варожых, контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратычных выступленьняў у маскацкай літаратуры.

Бюро партколектыву і кіраўніцтва інстытуту не арганізавалі кантролю-праверкі, выцягненьня кожнага работніка інстытуту ў пасобку, не прынялі рашучых мер па ачыстцы інстытуту ад клясава-варожых элементаў, якія праводзілі антысавецкую работу ў інстытуце, не забясьпечылі разгорт вацьня партыйна-масавай, палітычна-выхаваўчай работы, крытыкі і самакрытыкі ў арганізацыі, за што бюро парткалектыву ВПІ распусьціць.

б) Даручыць арганізэлу на працягу пяці дзён правесьці перавыбары бюро парткалектыву ВПІ.

в) Справы членаў КП(б)Б, скампрамітаваўшых і не апраўдаўшых сябе на адказнейшым участку нацыянальна-культурнага будаўніцтва, якім зьяўляецца ВПІ, перадаць на разгляд у ГК КП(б)Б.

г) Матар'ялы ў ГК КП(б)Б па ВПІ перадаць камісіі ЦК КП(б)Б, якая займаецца справай ВПІ ў цэлым.

*Ю. ТАРАСЮК*

# У АБРУЧОХ КРЫВАВЫХ ФАШЫСЦКІХ ДЭКРЭТАЎ

Пачынаючы з 1930 году фашысцкі ўрад Польшчы з мэтаю задушэньня рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызвалечага руху як у самой Польшчы, так і асабліва на акупаваных ЗБ і ЗУ выдае адзін за другім дэкрэты.

Як вядома, у 1931 годзе быў выдан дэкрэт аб увядзеньні ваенна-палявых судоў. У 1930 годзе ва ўсіх турмах Польшчы быў уведзен **крывавы фашысцкі рэгламант**, на падставе якога палітзьняволеныя былі зраўнаны з крымінальнымі, скасаваны ўсе іх правы, здабытыя шматгадовай упартай барацьбой — рэгламант фізычнага зьнішчэньня рэвалюцыянэраў. Потым **выдаецца новы карны кодэкс**, а за ім сьледам выдаецца дэкрэт **аб увядзеньні ваенна-палявых судоў у арміі і рэарганізоўваецца «Стралец».**

Выданьне дэкрэту аб увядзеньні ваенна-палявых судоў было выклікана магутным ростам рэвалюцыйнага руху ва ўсёй Польшчы. Гэты дэкрэт, як і ўсе іншыя, у першую чаргу накіраваны **супроць кампартыі, супроць працоўных мас Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны**, якія вядуць зацятую масавую, народна ўзброеную барацьбу з акупантам, а таксама і супроць забастовачнага руху.

Не дапамаглі карныя экспэдыцыі, якія шалеюць увесь час на тэрыторыі ЗБ і ЗУ. Пэлыя вёскі зруйнаваны, сьцёрты з аблічча зямлі. Шмат рабочых і сялян замучана па дэфонавых. Аднак, гэты крывавы тэрор ня толькі ня быў у стане задушыць рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызвалечага руху працоўных мас Польшчы, але нават яго аслабіць. І вось фашысты кодэкс вышэйшай мерай пакараньня прадбачыць кару сьмерцю, пажыцьцёвую катаргу і інш. Так караюцца асобы па абвінавачаньні ў антыдзяржаўнай дзейнасьці, вулічных хваляваньнях, забастоўках і г. д.

Такім чынам відавочна, што, як палявыя суды, так і новы карны кодэкс накіраваны ў **першую чаргу супроць пралетарыяту і яго авангарду — кампартыі.** Стары карны кодэкс за камуністычную дзейнасьць прадбачыў кару ад 4 да 8 год катаргі (хаця судзілі шмат вастрэй). Цяпер-жа, паводле новага карнага кодэксу, за камуністычную дзейнасьць суд можа засудзіць на сьмерць, на пажыцьцёвую катаргу і іншыя кары. Новы карны кодэкс разьвязвае рукі фашысцкім судом, дае ім большую магчымасьць ужо ў рамках фашысцкай «справядлівасьці» больш жорстка распраўляцца з рэвалюцыйным рухам, «законна» адпраўляць рэвалюцыйных рабочых і сялян на шыбеніцу.

Новы карны кодэкс увайшоў у жыцьцё з 1 верасьня мінулага году. Ад часу ўвядзеньня яго ўжо шмат ёсьць прытаваноў, шмат ужо рэвалюцыянэраў паслана на пажыцьцёвую шматгадовую катаргу. Новаўведзены кодэкс служыць фактычна дапамогай ваенна-палявым судом, бо калі апошнія будуць мець якую-небудзь замінку ў «працы», дык ім на дапамогу можа прыйсьці звычайны суд з новым кодэксам. Гэтак фашызму нават і зручней, бо бяз шуму і лішніх слоў рэвалюцыянэр будзе адпраўлен на шыбеніцу.

Здавалася-б, што пасьля выданьня такіх дэкрэтаў ахова клясавага панаваньня фашысцкай дыктатуры моцная. Аднак, на справе гэтага няма. Рэвалюцыйная хваля ўсё з большай сілай, усё прадыгай б'е ў асновы фашысцкай дыктатуры. Таму сьледам за ўвядзеньнем ваенна-палявых судоў, по вага карнага кодэксу ў пачатку студзеня 1933 году **выдаецца новы дэкрэт аб увядзеньні ваенна-палявых судоў у арміі для салдат, вайскова-служачых і рабочых ваеннай прамысловасьці.** Паводле гэтага дэкрэту над ваенна-палявым судам падпадаюць усе асобы па абвінавачаньні ў **непадпарадкаваньні ваеннай уладзе, за рэвалюцыйную дзейнасьць, забастоўкі, дэманстрацыі** і г. д. Кара прадбачыцца самая вострая, уключна да расстрэлу.

Новы дэкрэт, які па свайму ліку зьяўляецца **трэцім**, сьведчыць аб тым, што польскі фашызм усё больш узмацняе крывавы тэрор, накіроўваючы яго ў першую чаргу супроць кампартыі, рабочай клясы, працоўнага сялянства і салдацкіх мас.

Чым выклікан гэты дэкрэт? Ён выклікан перш за ўсё сыстэматычным ростам рэвалюцыйных настрояў сярод салдацкіх мас, якія перастаюць быць надзейнай зброяй у руках фашысцкай дыктатуры. Часта здараюцца выпадкі адмаўленьня салдат выконваць загады афіцэраў, адмаўленьня ісьці супроць мірных, расстрэльваць рабочую дэманстрацыю, душыць забастоўкі, сялянскія паўстаньні. Тая магутная барацьба, якую вядуць шырокія працоўныя масы, гучным рэхам адбіваецца і сярод салдацкіх мас, ізаляваных у казарках. Салдацкія масы ня хочуць быць пасыўнымі наглядальнікамі, яны прымаюць актыўны ўдзел у гэтай барацьбе супроць дыктатуры фашызму. І вось супроць гэтага руху і накіраван новы дэкрэт фашызму.

Адначасова з дэкрэтам аб ваенна-палявых судох у арміі выдан дэкрэт аб рэарганізацыі «Стральца». Паводле гэтага дэкрэту, фашысцкая ваенная арганізацыя «Стралец» фактычна ператвараецца ў дзяржаўную армію, непасрэдна падпарадкаваную вайсковаму міністру. Дэкрэт мае на мэце ўстрымаць той вялікі працэс разложэньня, які зараз адбываецца ў гэтай арганізацыі. Адначасова рэарганізацыя «Стральца» мае на мэце ўзьняць дысцыпліну ў яго радах, ператварыць яго ў армію, якая была-б заўсёды вернай зброяй у руках фашызму ў яго крывавай расправе над рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі.

Рэарганізацыя «Стральца» мае асобае значэньне для акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіны, дзе зараз цэлыя раёны ахоплены сялянскімі паўстаньнямі. Моцны і дысцыплінаваны «Стралец» патрэбен акупанту для панаваньня на Зах. Беларусі і Зах. Украіне — плацдарму будучай вайны з СССР. Рэарганізацыя «Стральца» і выдача дэкрэтаў аб ваенна-палявых судох лішні раз сьведчыць **аб інтэнсіўнай ваеннай падрыхтоўцы польскага імпэрыялізму.**

Гэтыя апошнія дэкрэты паказваюць, што Польшча ў сувязі з абвастрэньнем становішча фашызму краіны шпаркім тэмпам ператвараецца **ў адзіны суцэльны ваенны лягер, зжацяваны абручамі крывавых фашысцкіх дэкрэтаў.**

Фашызму мала ваенна-палявых судоў, мала тых ахвяр, якія ўжо загінулі ў яго крывавых лапах. Фашызм вуснамі свайго міністра юстыцыі п. Міхалоўскага прагне больш рабочай крыві. **Ён імкнецца фізычна зьнішчыць рэвалюцыйных рабочых і сялян — салдат, зьнішчыць кампартыю.**

Вядомы віленскі мануфхіст пілсудчык, пасол з ББ, патэнцыял інтэрвэнцыі супроць СССР — **п. Мацкевіч** у сваёй газэце «Слова» ад 31 сьнежня 1932 г. упадае ў захапленьне, калі вешаюць рэвалюцыянэраў. Ён заклікае нават сваіх братоў па пяру і тэмпару скакаць вакол шыбеніц, на якіх павісае рэвалюцыянэр.

«Бальшавікі (бальшавік у фашысцкім разуменьні — гэта нават звычайны рабочы, які вядзе барацьбу супроць капіталістаў — Ю. Т.), калі гасьцюць на шыбеніцах, дык мы павінны вакол гэтых шыбеніц скакаць... Літасьць у адносінах да бальшавікоў зьяўляецца антыгуманнасьцю».

Вось лёзунг акупанта на падняволе ным Зах. Беларусі. Каб утрымаць падалей сваё панаваньне на ЗБ і ЗУ, п. Міцкевіч заклікае ўрад яшчэ больш узмацніць тэрор і накіраваць яго, галоўным чынам, супроць кампартыі — гэтай адзінай партыі, якая сапраўды безкампрамісна вядзе барацьбу за вызваленьне працоўных з кайданоў уціску эксплёатацыі, голаду і вайны.

Фашысцкі ўрад старанна праводзіць гэты лёзунг у жыцьцё. Пры дапамозе сацыял-і нацыянал-фашыстаў, гэтых верных служак капіталу, адданейшых абаронцаў пакрэпь прагнілай капіталістычнай сыстэмы — сыстэмы барбарскай эксплёатацыі і нацыянальнага прыгнечаньня, — клясавы суд амаль штодня адпраўляе на шыбеніцу лепшых сыноў рабочай клясы і працоўнага сялянства. Вешаюць нават пяцёх пагадовых, як гэта мела месца ў радзе мясцовасьцяй Зах. Беларусі і Зах. Украіны. Так, **у Сьвянцянах** (Віленшчына) пазьбі на шыбеніцах мала дзьвя хлапцы 17-18 год. **У Львове** за апошні час павешаны два малацыя украінцы — **Білас і Данілішын**, якія змагаліся супроць акупацыі Зах. Украіны.

Але ня гледзячы на ўсю жорсткасьць палявых судоў, фашызм, у прыватнасьці крывавы міністар пан Міхайлоўскі пахабна заяўляе, што ў даны момант палявыя суды надта лёгка судзяць і што трэба распраўляцца з рэвалюцыянэрамі больш жорстка. Парадні — міністар унутраных спраў з сойміцкай трыбуны падаўла катэгарычна заяву, што ніякай літасьці ў адносінах да камуністаў, да рэвалюцыйных рабочых і сялян ня можа быць і што яны будуць праследавацца самымі жорсткімі спосабамі.

Што гэта азначае? Гэтыя заявы польскіх міністраў гавораць аб узмацненьні крывавага фашысцкага рэжыму, рэжыму шыбеніц, турмаў, расстрэлаў, каб тым самым забясьпечыць свае панаваньне і больш пасьпяхова весьці падрыхтоўку да інтэрвэнцыі.

Але дарэмныя спробы фашызму шляхам самага разбэшчанага дзікага тэрору задушыць рэвалюцыйны рух працоўных мас Польшчы. Ня гледзячы на ўзмацненьне тэрору, рэвалюцыйны і нацыянальна-вызвалечы рух у Польшчы расьце, магутнее і прымае ўсё больш масавыя баявыя формы. Пралетарыят Польшчы, ЗБ і ЗУ і шырокія працоўныя масы сялянства ня хочуць мірна несьці ярмо капіталу, ярмо ўціску і эксплёатацыі і паміраць галоднай сьмерцю. Яны пераконваюцца на прыкладзе працоўных Савецкага саюзу, што трэба ісьці па шляху гэтых апошніх, якія скінулі ярмо капіталу і будуюць новае сацыялістычнае жыцьцё, ня вялікорны, беспрацоўя і ўсіх яго жудасных вынікаў.

Ня гледзячы на жорсткую цэнзуру, працоўныя Польшчы добра ведаюць аб жыцьці ў СССР, аб будаўніцтве сацыялізму. Працоўныя Польшчы ня слухаюць паклёпаў на СССР. На прыкладзе краіны Саветаў пралетарыят і працоўнае сялянства Польшчы пераконваюцца, што будаўніцтва сацыялізму магчыма і ў іх краіне, але толькі тады, калі будзе скінута дыктатура капіталу, дыктатура фашызму і акупацыя ЗБ і ЗУ.

Ня гледзячы на крывавыя фашысцкія дэкрэты, ваенна-палявыя суды, шыбеніцы і расстрэлы працоўныя масы Польшчы, ЗБ і ЗУ яшчэ шчыльней згуртоўваюцца вакол кампартыі і адкідваюць магутным узьнымам рэвалюцыйнага руху, жалезнай сьцяной становіцца на абарону СССР.

# 11.000 РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ РАБОЧЫХ ЗА КРАТАМІ ФАШЫСЦКІХ ТУРМАЎ

## „Тэрор—якога ня было ў Эўропе“

**ЛЕНДАН, 16.** Жэнэўскі карэспандэнт «Манчэстэр Гардыян» перадае вытрымку з ліста, атрыманага з Бэрліну адным жэнэўскім жыхаром. У ліст ён паведамляецца, што нацыянал-сацыялісты арыштоўваюць камуністаў у кватэрах і на вуліцах, возяць іх у свае казармы і там здзекуюцца над імі.

«У сваіх казармах,—гаворыцца ў лісьце,—нацыянал-сацыялісты збіваюць камуністаў, ламаюць ім пальцы, вымагаючы ад іх прызнаньня і адрасу. У нацыянал-сацыялісцкіх казармах на **Гедэбанштрасэ**, у адной кватэры лянькуць каля 150 камуністаў, з якіх зьдзекваліся, пакуль яны ня страцілі сілы і прытомнасьці».

Ліст паведамляе далей, што камуністаў распранаюць дагала і ганяюць скрозь палачны строй, пакуль яны не зваліваліся паўмёртвымі.

У **Шпандау** амаль усе камуністы арыштаваны, адведзены ў фашысцкія казармы, дзе яны падвяргаюць катаваньням. «Адна камуністка расказала, што яна была падвята з пасьцелі, прыведзена ноччу ў казарму, была зьбіта бізунамі і кінута ў пагвал. Калі яна прыйшла ў сябе, яна заўважыла, што была азружана стагнаўшымі, або паўмёртвымі людзьмі. Некаторых выпускаюць на волю пасьля катаваньняў, а іншыя ніколі больш ня ўбачаць сьвету».

Камэнтуючы ліст, карэспандэнт «Манчэстэр Гардыян» піша: «Усе весткі, якія прыходзяць з Германіі, гавораць пра тое, што там тэрор, падобнага якому ня было ў Эўропе і якога не памятаюць сучасьнікі».

## НАПАДЫ ФАШЫСЦКІХ БАНДЫТАЎ НА САВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН

### Рашучы пратэст савецкага паўпрэдзтва

**БЭРЛІН, 16. УЧОРА Ў ЧАСЕ ВОБЫСКУ Ў КАЛЕНІЯХ РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВА БЫЎ АРЫШТОВАН САВЕЦКІ СТУДЭНТ-ТЭХНІК ЛУР'Е. Ён быў арыштован на вуліцы пры выхадзе з дому. Ня гледзячы на тое, што Лур'е прад'явіў савецкія дакуманты, ён быў пасаджан у паліцэйскі аўтамабіль, ЛУР'Е БІЛІ КУЛАКАМІ І ГУМОВЫМІ ДУБІНКАМІ, ПРЫЧЫМ, У ЧАСЕ ЗЬБІЕНЬНЯ ПАЛІЦЭЙСКІЯ НАЗЫВАЛІ ЯГО «ЗАБОЙЦАЙ», «ЗАЯДЛЫМ САВЕЦКІМ КАМІСАРАМ», ПРАКЛІНАЛІ ПЯЦІГОДКУ І г. д. Да 1-й гадзіны дня Лур'е праслядзеў у аўтамабілі, прычым, ахоўваючы яго паліцэйскі расказваў яму пра катаваньні, якія яму прадстаяць і аб тым, што ён будзе расстрэлен. Перад тым, як Лур'е павялі з калёны, яго прабавалі прымушаць сьпяваць рускія песьні і падымаць руку ў адзнаку фашысцкага прывітаньня.**

**На дварэ паліцэй-прэзыдыуму Лур'е зноў зьбілі гумовымі дубінкамі, потым яго пасадзілі ў арыштнае памяшканьне і, пасьля дольту ў 10 гадз. 30 мін. вечара, асьлабілі. НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА НЕАДНАРАЗОВАЕ НАСТОЙВАНЬНЕ ЛУР'Е ПАВЕДАМІЦЬ АБ ЯГО АРЫШЦЕ ПАЎПРЭДЗТВА СССР, ЯМУ Ў ГЭТЫМ БЫЛО АДМОЎЛЕНА.**

Забітыя нацыянал-сацыялістамі рабочыя: ГЭНРЫХ ЛІПС (Кельн), РОБЭРТ РОТКЕ (Кельн), МАРЦІН ЛЕУШЭЛЬ (Гарбург) і РЫХАД ПЭТЫНГ (Бэрлін).

## Зьмена кіраўніцтва германскага рэйхсбанку

**БЭРЛІН, 17.** Агэнцтва Вольфа паведамляе: «Старшыня праўленьня рэйхсбанку **Лютэр** падаў у адстаўку. Яго пераемнікам назначан былы старшыня праўленьня рэйхсбанку **Шахт**».

Аб значаныя гэтай зьмены кіраўніцтва рэйхсбанку для германскай валютнай і народнай гаспадаркі даволі ня двухсэнсоўна гаворыць берлінскі орган нацыянал-сацыялістаў «Ангрыф», які піша: «З адыходам Лютэра і назначэньцем Шахта выяўляецца шлях для такой эканамічнай палітыкі, мэта якой—прыцягнуць бес працоўных у гаспадарчыя працэсы. Лютэр быў тым, хто ў апошні час заўсёды перашкаджаў якой-бы там ні было спробе ажыцьцявіць шырокую праграму адшкаваньня работы для беспрацоўных. Ён заўсёды высоўваў на першы плян ананімныя мерканаваньні аб ахове валюты. Лютэр быў у сапраўднасьці абаронцай інтэрэсаў між народных буйных фінансістаў»...

## Напад на швэцкага консула

**БЭРЛІН, 16.** Па вестках паліцыі, у **Штутгарце** 19 лютага два невядомых уварваліся ў кватэру швэдзкага генэральнага консула і моцна яго зьбілі.

## Ангельскае пасярэдніцтва ў франка-нямецкім канфлікце

ЛЕНДАН, 16. Камэнтуючы надыходзячую паездку Маклінальда і Саймона ў Рым, «Дэйлі Тэлеграф» у перадавым артыкуле піша: «Англія зацікаўлена ў тым, — піша газэта, — каб у Эўропе ня было гегемоніі і пры тым у такой-жа меры, як зацікаўлена Італія. Ангельскія міністры імкнуцьмуць скарыстаць з магчымасьцяў, якія знаходзяцца ў іх сурэчнага і магутнага пасрэдніка ў палажэньні зьмяжчэньня франка-нямецкіх супярэчнасьцяй.

## 27 сакавіка суд над вязьнямі Скотсбора

**НЮ-ЕРК, 16.** Як падае «Асашыэтэд прэс», амэрыканскі суд абвясьціў, што можа слуханьне справы вязьняў са Скотсбора пачнецца ў **горадзе Дэкатур 27 сакавіка.**

19-а сакавіка а 7 гадзіне вечары ў памяшканьні ЦК КП(б)Б (заля пленуму)

адбудзецца пасяджэньне **ПЛЕНУМУ Менгаркому КП(б)Б**

**АЗАМ З САКРАТАРАМІ ПАРТКАЛЕКТЫВАЎ І ЯЧЭЕК гор. Менску.**

Члены і кандыдаты ПЛЕНУМУ ГК абязкодзяць па сваіх мацунках. Сакратары партколектываў і ячэек атрымліваюць білеты ў памяшканьні ГК КП(б)Б 19-га сакавіка з 10 гадзін раніцы да 4 гадзін дня, па а/і № 32.

**МЕНГАРКОМ.**

## ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

### У красавіку ў Менску пачынаецца выдача пашпартоў

(Гутэрка са старшынёй гарсавету т. Ваподзька)

У адпаведнасьці з пастановай саюзнага ўраду, **З ПАЧАТКУ КРАСАВІКА ПА ЧЭРВЕНЬ У МЕНСКУ БУДЗЕ ПРАВОДЗІЦЦА ВЫДАЧА ПАШПАРТОЎ** насельніцтву.

Вялізарнае палітычнае значэньне пашпартнай сыстэмы сфармулявана ў пастанове ўраду, якая ўказвае, што гэта новая сыстэма мае мэтай ня толькі ўлік насельніцтва, але і разгрузку гарадоў, рабочых паселкаў і новабудоўляў «ад асаб, нязьвязаных з вытворчасьцю і работай на ўстановах і школах і незанятых грамадзка-карыснай працай (за выключэньнем інвалідаў і пэнсыянэраў), а таксама ў мэтах ачысткі гэтых насельніцкіх месц ад кулацкіх, крымінальных і інш. антыграмадзкіх элемэнтаў, якія ўкрываюцца».

Падрыхтоўка да выдачы пашпартоў ужо распачата. Загатоўлена неабходная колькасьць пашпартных кніжак, гербовых бланкаў і часовых пасьведчаньняў. Горад падзелены на 30 пашпартных пунктаў. На найбольш буйных прадпрыемствах арганізуюцца самастойныя пашпартныя пункты. У першую чаргу выдача пашпартоў пачнецца на фабрыках і заводах.

Атрыманьне пашпарта для рабочага, служачага і кожнага грамадзяніна, які займаецца грамадзка-карыснай працай, ня будзе сустракаць ніякіх труднасьцяй, бо на аснове спэцыяльна выданай інструкцыі дарогі будзе прадастаўлены ня стандартнай спраўкі, запоўненай прадпрыемствам, установай, або жантам, вучотна-эйсковага бюро і даку манту аб месцы нараджэньня і паходжаньні.

Дано ўказаньне камунальнаму аддзелу, гаржыласэкзу і жытпросту аб забароне на час выдачы пашпартоў якіх-бы там ні было варыянтаў з жыцлоспчаю (перамяшчэньне, абмен жэтэр) без санкцыі камунальнага аддзелу.

Тая вялізарная работа, якая прыпадае на органы менскай міліцыі, павінна сустрэць падтрыманьне з боку ўсіх грамадзкіх арганізацый. Неабходна актыўная дапамога партыйных, прафсыяцкіх і ўсіх грамадзкіх арганізацый у правядзеньні гэтай новай важнай і ўдарнай работы. Асабліва важна рэбота па вылучэньні сацыяльнай фізыяноміі, па ўстаноўленьні клясавай характарыстыкі сумнэўных элемэнтаў.

Пры гэтай умове нам удасьцца ачысьціць Менск ад антыграмадзкіх, кулацкіх, крымінальных і іншых апачыніных элемэнтаў.

М. К.

## Адкрыўся зьезд жыльлёвай кааперацыі

15 сакавіка ў клюбе мэдрабацнікаў у Менску адкрыўся цяперашні ўсебеларускі зьезд жыльлёвай кааперацыі. У рабоце яго прымае ўдзел 150 дэлегатаў.

У камісіі прэзыдыуму выбраны: палітбюро ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным, бюро ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало, т. т. Рудзутак, Тэльман і Лекскі. У дзелавы прэзыдыум выбрана 17 чалавек.

На першым пасяджэньні з дакладам аб рабоце жыльлёвай кааперацыі БССР выступіў тав. **Шчацько.**

Жыльлёвая кааперацыя Беларусі мае рад бясспрэчных посьпехаў. Значна ўзрасла жыльлёвая плошча. Як найлікаў павялічыўся на 326 процэнтаў, памножаньнем узрасло ў 10 разоў. Створана ўласная база вырабу новых будматар'ялаў і стандартных дамоў.

Адтак, жыльлёвая кааперацыя на многіх вучастках далёка апаздавала ад гарадзкіх прадпрыемстваў, не ўмела ўлічыцца з пастаўленымі перад ёю задачамі.

Работнікі кіруючага органу і ўвесь апарат жыльлёвай кааперацыі не перабудавалі сваёй работы на аснове новага гаспадарчага разрэхунку, не палічыліся эканомічна грамадзкіх і дзяржаўных трошы, пяйвалі, а часам і значныя адносіцца да захаваньня дзяржаўнай маемасьці, да запатрабаваньняў працоўных мас. Гета асабліва выявілася ў часе справаздачна-перавыборчай кампаніі жакта ў і гарыкасаюзаў.

Жыльлёвай кааперацыі як такой, трэба павучыцца будаваць, разьлічваць і асабліва гаспадарча закоўваць жыльлёвы фонд, яны кіраўніцтва жакт і ЖБКТ. 1933 год павінен быць пераломным у справе рашучага паляпшэньня і ўдасканаленьня работы жыльлёвай кааперацыі БССР.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

## НОВАЯ ПРАВАКАЦЫЯ ГЕРМАНСКАГА ФАШЫЗМУ

### Абвінавачаньне камуністаў у крадзежы выбуховых матэрый

**БЭРЛІН, 16.** Як паведамляе друк, на нарадзе габінэту быў заслуханы даклад аб падрыўной дзейнасьці камуністаў. Была выступка прапанова вызначыць паўны тэрмін для зьвароту пібы пакрадзеных камуністамі выбуховых матэрый. Мо пібы з украдзеных 3.000 цэнтн. выбуховых матэрый знойдзена толькі 200 цэнтн. Да вінаватых у пакражы выбуховых матэрый прадугледжваецца суровыя пакаранні.

Далей, у афіцыяльным паведамленьні гаворыцца, што на нарадзе высунута прапанова скасаваць з 1 красавіка ўсе пропускі, якія выдаваліся працоўным цам за прыпытых рабочых.

***

**БЭРЛІН, 16.** Як падае тэлеграфнае агэнцтва «Гунэр», **усяго ў Германіі арыштавана 11 тыс. рэвалюцыйных рабочых і работнікаў рузумовай працы.** 16 лютага ў Майне, на паведамленьні «Вольфа», у зьвязку з тым, што камуністычная партыя за апошнія дні зноў распачала актыўную дзейнасьць, арыштаваны 22 камуністы. Апрач таго, арыштаваны 17 членаў кампартыі па падазронасьці ў пакражы выбуховых матэрый. У **Нейтрэліцы** арыштаваны член ляндтагу камуніст **Вернке.** Па распараджэньні мясцовага міністэрства ўнутраных спраў, праведзены вобыскі ў мясцовых арганізацыях і газэтах сацыял-дэмакратычнай партыі. Адначасова працягваецца канфіскацыя газэт, робіцца павальныя вобыскі ў калёніях працоўных каля **Патсдаму.** У часе вобыскаў адбываліся арышты. У **Вольхенгэйме,** каля Брэслаўля, арыштавана 11 камуністаў. Саксонскі ўрадавы камісар выдаў распараджэньне забараніць перавыбары фабзаўкомаў у **Саксоніі.** Акрамя таго, членам фабзаўкомаў і профсаюзным упаўнаважаным, якія належаць да кампартыі, забаронена выконваць свае функцыі.

У Гамбургу арыштаваны вядомы сваёй нацыфіскай дзейнасьцю генэрал-маёр Шэйнах.

***

**БЭРЛІН, 15.** Сёньня ўдачы некалькі нацыянал-сацыялісцкіх штурмавікоў уварваліся ў кватэру савецкага грамадзяніна, вядомага доктара-эндэкрыналёга **ІШЛОНСКАГА.**

**Ня гледзячы на тое, што Ішлонскі прад'явіў свой пашпарт і што, такім чынам, налётчыкі ведалі, што маюць справу з грамадзянінам СССР, яны захапілі Ішлонскага, пацягнулі яго ў аўтамабіль і павезьлі ў дом, дзе знаходзіцца інтэрнат «Госьпіт фюр юнгэ мэнэр». Там Ішлонскага зьбівалі кулакамі і жалезнаю палкай.**

**АДЗІН З НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСТАЎ, ЯКІ УЗЯЎ У ІШЛОНСКАГА ПАШПАРТ, БІЎ ЯГО ПАШПАРТАМ ПА ТВАРЫ, ЗАЯЎЛЯЮЧЫ, ШТО Б'ЮЦЬ ЯГО ЗА ТОЕ, ШТО ЁН САВЕЦКІ ГРАМАДЗЯНІН. Потым Ішлонскага прывязалі ў пакоі да жалезнай рашоткі заявіўшы, што ён будзе расстрэлен, і зрабілі зваду тры стрэлы. Пасьля Ішлонскаму было заяўлена, што расстрэльваць яго раздумалі і прапанавалі яму мэўчаць аб тым, што з ім адбылося, пагражаючы, што інакш ён будзе застрэлен з-за вугла. Пашпарт Ішлонскаму не вярнулі, патрабаваўшы, каб ён у паўпрэдзтве заявіў, што ён згубіў яго. Затым Ішлонскага адвезьлі ў далёкі раён гораду і пусьцілі.**

**МЭДЫЦЫНСКІ АГЛЯД УСТАНАВІЎ НА ЦЕЛЕ ІШЛОНСКАГА КРЫЗАПАДЦЕКІ; АПРОЧ ТАГО, НА ГАЛАВЕ Ў ЯГО ВЫРАЗАНЫ ВАЛАСЫ.**

**ПАЎПРЭДЗТВА СССР У БЭРЛІНЕ ЗАЯВІЛА МІНІСТЭРСТВУ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ГЕРМАНІІ ЭНЭРГІЧНЫ ПРАТЭСТ.**

## „Хто ня з намі—той павінен загінуць“

**БЭРЛІН, 16.** Камісар баварскага міністэрства ўнутраных спраў і загадчык мясцовага камітэту нацыянал-сацыялісцкай партыі **Вагнэр** у гутарцы з супрацоўнікам «Фолькішэр Бэобахтэр» заявіў: «Я патрабую, каб прафсаюзы ні ў якай ступені не займаліся палітычнай дзейнасьцю, г. зн. дзейнасьцю ў марксыцкім сэнсе. Прафсаюзы павінны абмежавацца тэй галіной, якая іх датычыць і не перакрочыць яе. Хто не з намі,—той павінен загінуць».

**19-га сакавіка,**

**у 7 гадзін вечара, у памяшканьні Менгарсавету**

(вялікая заля) адбудзецца

**ПЛЕНУМ**

**гандлёва-кааперацыйнай сэкцыі Гарсавету разам з кооперактывам ИГРК.**

Арг. мясавы аддзел Менгарсавету.

**З 20 сакавіка г. г.**

**бюро наборных дакумантаў пачынае выдачу**

**НАБОРНЫХ КАРТАК на красавік**

**і стандартных даведак на 2-гі квартал 1933 г.,**

таму тэрмін, паказаны ў абвестцы, якую кожны атрымаў пры дачы заяўкі на красавік, на тры дні скарачаецца, напрыклад: калі вызначан тэрмін 23-III, дык патрэбна зьявіцца за атрыманьнем картак 20-III і г. д., а годзіны не зьмяняюцца.

Парадак выдачы наборных картак навуковым працаўнікам, пэнсіянэрам, партызанам, вылучэнцам і 23-тысячнікам, утрымцам чырвонаармейцаў, утрымканцам і камандзіраваным на працу ў іншыя мясцовасьці і прымаданым да спецгазыняў Белгандлю і МГРК застаецца стары, які быў на сакавік месяц.

**На 19-III—33 г.** у 7 гадзін вечара, **склікаецца**

**інструкцыйная нарада**

усіх кіраўнікоў ЖАКТ'аў, дэпэнігоўніцтваў і нач. міліцыі ў памяшканьні клюбу Гарсавету (Пляц Волі, № 4, 2ці паверх)

па пытаньні **запаўненьня стандартных даведак.**

Гарснаб **ГАНТМАН.**

Заг. бюро наборных дакумантаў **ШАПАТКОЎСКІ.**

**ДА ВЕДАМА** дэлегатаў—ўдзельнікаў усебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў!

Кіраўніцтва ашчадкасамі і Дзяржкрэдыту БССР

*паведамляе, што*

**на ЗЬЕЗДЗЕ** будзе працаваць спэцыяльны **даведачны стол**

па праверцы аблігацый усіх пазык і лётарэйных білетаў,

які будзе на месцы выплачваць выйгрышы і % % па купонах.

Калі хочаш ведаць ці ты выйграў—прывязі з сабой аблігацыі ўсіх пазык і лётарэйныя білеты, або перапішы нумары серый і аблігацый.

Ашчадкасы і сельсаветы—шырока апавясьцеце аб гэтым.

Кіраўніцтва Ашчадкасамі і Дзяржкрэдыту БССР.

**КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“**

**ад 17 сакавіка і штодзённа в. МАЛІНОЎСКАЯ, П. БАКШЭЎ і О. ЖЫЗЬНЁВА**

У МАСТАЦКІМ ФІЛЬМЕ

**ЧУЖАЯ**

Драма ў 6 частках.

Зьвыш праграмы—**хроніка Саюзкіно.**

Каса адкрыта—з 12 гадз. дня.

**Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ-1)**

Маст кіраўн. ЛІТВІНАЎ, Л. і П. ТУР.

СЁНЬНЯ

**ЗЯМЛЯ І НЕБА**

п'еса ў 4-х дзеях.

Пачатак у 8 г.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ КАСА—ад 1 г. дня

**НАЕЗЬНІК** в УАЙЛЬД-ВЭСТА 2 серыі ў адзін сэанс.

І-шы дзіцячы гуковы кіно-тэатр КАСА—з 10 г. ран.

Гуковая праграма 1) **БЯГЛЕЦ,** 2) Паравоз, які наперад

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Каса—ад 12 г. дня

Мастацкі фільм **ДАЧКА РАФКЭ**

„СПАРТАК“ КАСА—ад 1 г. дня

Замежны фільм **ДОННА ЖУАНА** Камедыя ў 9 частках.

**Памяшн. Яўр. Дзярж. Тэатру** (вул. Валадарскага, 7, тэл. 21-813)

**СЁНЬНЯ 18 ЛЮТАГА**

Адноўленая праграма

**МЮЗІК-ХОЛ**

Пачатак—8 г. 30 м. вечара.

**Штодзённа адно выступленьне ў двух вялікіх аддзяленьнях.**

**ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК**

*АДКРЫТА*

**ПАПЯРЭДНЯЯ ПАДПІСКА НА**

**І ТОМ „КАПІТАЛУ“ КАРЛА МАРКСА**

**на беларускай мове**

**ПЕРШАЕ І другое,** патанёнае выданьне выйдзе ў 5 выпусках па 3 руб. за выпуск, юбілейнае выданьне багата ілюстраванае, на лепшай паперы, у каленкоравым пераплёце **цаною 18 руб. пры падпісцы.**

Юбілейнае выданьне частаю будзе выпушчана патаненым выданьнем для масавага распаўсюджаньня праз арганізацыі.

Грошы і пярэдпадпіскі накіроўваць па адрасе: МЁНСК, БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК, ВЫДАВЕЦТВА.

**БЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ**

ПАВЕДАМЛЯЕ,

**што ўсе предпрыемствы і ўстановы гораду Менску павінны да 20 сакавіка г. г. ПРАДСТАВІЦЬ**

**КАСАВЫЯ ПЛЯНЫ НА 2-гі КВАРТАЛ**

У МЕСЯЧНЫМ РАЗРЭЗЕ ПА НАСТУПНАЙ ФОРМЕ:

| № п. п. | Назва артыкулаў | Усяго за кварт. 1 кал. аг. звар. | Усяго за кварт. 2 кал. навуч. | Красавік 1 кал. аг. звар. | Красавік 2 кал. навуч. | Май 1 кал. аг. звар. | Май 2 кал. навуч. | Чэрвень 1 кал. аг. звар. | Чэрвень 2 кал. навуч. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | ПРЫБЫТАК | | | | | | | | |
| 1 | Выручка ад розьніч. рэалізац. | | | | | | | | |
| 2 | Прырост паёў і ўклад. | | | | | | | | |
| 3 | Іншыя паступ. навучныя | | | | | | | | |
| 4 | Астача касы на пачат. плян. перыяду | | | | | | | | |
| | УСЯГО | | | | | | | | |

| № п. п. | Назва артыкулаў | Усяго за кв. 1 кал. аг. звар. | Усяго за кв. 2 кал. навучным | Красавік 1 кал. аг. звар. | Красавік 2 кал. навучным | Май 1 кал. аг. звар. | Май 2 кал. навучным | Чэрвень 1 кал. аг. звар. | Чэрвень 2 кал. навучным | ЗАЎВАГІ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | ВЫДАТАК | | | | | | | | | |
| 5 | Зарплата | | | | | | | | | |
| 6 | Гасп. апарат. выдаткі каманд. выдат. | | | | | | | | | |
| а) | гасп. выдат. | | | | | | | | | |
| б) | С.-г. загатоўкі | | | | | | | | | |
| 7 | Іншыя ня с-г. загатоўкі | | | | | | | | | |
| 8 | Ізвоз | | | | | | | | | |
| 9 | Астача касы на канец плян. перыяд | | | | | | | | | |
| 10 | УСЯГО | | | | | | | | | |
| 11 | Сальдо | | | | | | | | | |

ЗАЎВАГІ: 3 выручкі будзе выдаткавана 1. На зарплату 2. На гасп. выдаткі 3. С.-г. загатоўкі 4. Іншыя загатоўкі.

Непрадстаўленьне кас. пляну арганізацыямі і прадпрыемствамі пагражае за сабой **спыненьне выдачы наяўных грошай.**

**БЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ.**

## АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА

### Менскага Гарадзкога Савету рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў

*16 сакавіка 1933 г.* *г. Менск*

### АБ БАРАЦЬБЕ З ПАВОДКАЙ

Менскі гарадзкі савет **пастанаўляе:**

1. Штаб гарадзкой камісіі на барацьбе з паводкай, створены ў складзе: начальніка Кампасу т. Кавалёва (старшыня камісіі), камэнданта гораду т. Харальца, начальніка аддзелу адм. нагляду Галоўміліцыі т. Дэрмана, інспэктара дабрабыту т. Капцана і начальніка пажарнай аховы т. Казачэнка размясьціць у памяшканьні Кампасу (Пляц Волі, 2-гі паверх). Тэлефон № 23-165.

Устаналіць у штабе сутачнае дзяжурства з часу пачатку паводкі.

2. З 16 сакавіка г. г. арганізаваць на гораду тройкі на барацьбе з паводкай з ахопам наступнай зоны іх дзейнасьці:

**Тройка 1-га раёну** (правы бераг р. Сьвіслач) ахоплівае вуліцы: Кастасную, імя Шаўчэнка, Нова-Мясьніцкую, Замкавую, Надзямкавую і Надзямкавую н-б. Месца знаходжаньня тройкі ўстанавіць у памяшканьні лямпава-вяровачнай фабрыкі (Калгасная вул. № 61). Тэл. тройкі № 21-368. Начальнікам тройкі прызначыць т. Завадзкага (нач. 4-га аддзяленьня міліцыі).

**Тройка 2-га раёну** (правы бераг р. Сьвіслач) ахоплівае вуліцы: Ніжні Рынак, Гандлёвую, Гандлёва-Ўзьбярэжную, Шырокую, Акцябрскую, Пралетарскую. Месца знаходжаньня тройкі ўстанавіць у памяшканьні 1-га аддзяленьня міліцыі (Гандлёвая, 27). Тэлефон № 22-686. Начальнікам тройкі зацьвердзіць т. Паваротнага (начальнік 1-га аддзяленьня міліцыі).

**Тройка 3-га раёну** (правы бераг ракі Сьвіслач) ахоплівае вуліцы: Садовую, Садова-Ўзьбярэжную, Савецкую, Савецка-Ўзьбярэжную, Гарбарную, частку імя Варашылава і Людачную. Месца знаходжаньня тройкі ўстанавіць у памяшканьні Белпедтэхнікуму (Савецкая, 107). Тэлефон № 20-627. Начальнікам тройкі прызначыць т. Тышкевіча (інспэктар міліцыі).

**Тройка 4-га раёну** (правы бераг р. Сьвіслач) ахоплівае вуліцы: Аранскую, Лугавую, Лугавы завулак, Аранжавую, Аралкарэйную і Паляную. Месца знаходжаньня тройкі ў памяшканьні 2-й пажарнай часткі (Аранская вул.). Тэлефон тройкі № 21-692. Начальнікам тройкі прызначыць т. Ігнаткевіча (начальнік 3-га аддзяленьня міліцыі).

**Тройка 5-га раёну** (левы бераг р. Сьвіслач) ахоплівае вуліцы: млын Дзяржынскага, М. Серабранка і Індустрыяльная. Месца знаходжаньня тройкі ўстанавіць у памяшканьні канторы млыну імя Дзяржынскага. Тэлефоны тройкі №№ 22-125 і 22-126. Начальнікам тройкі прызначыць т. Парамончыка (інспэктар міліцыі).

**Тройка 6-га раёну** (левы бераг р. Сьвіслач) ахоплівае вуліцы: Варашылава, Пуліхаўскую Слабаду, частку вуліцы імя Фрунзе, Чырвонаармейскую, Плябанскі зав., Шырокую і Пралетарскую. Месца знаходжаньня тройкі ўстанавіць у памяшканьні 2-га аддзяленьня міліцыі. Тэлефон тройкі № 22-688. Начальнікам тройкі прызначыць т. Зальшмана (начальнік 2-га аддзяленьня міліцыі).

**Тройка 7-га раёну** (левы бераг р. Сьвіслач) ахоплівае вуліцы: Камунальную, Стара-Віленскую, Стара-Слабадзкую, Маладчынскую і Інвалідную. Месца знаходжаньня тройкі ўстанавіць у памяшканьні заводу малочных кіслот (вул. Мопру, № 101). Тэлеф. тройкі № 21-809. Начальнікам тройкі прызначыць т. Малажавага (інспэктар міліцыі).

Абавязаць райтройкі з 16 сакавіка арганізаваць дзяжурствы членаў тройкі.

3. Абавязаць кіраўнікоў заводу «Камунар», Электрастанцыі, ф-кі імя 8-га сакавіка, 1-й савецкай лазьні, млыну імя Дзяржынскага, чыгуна-ліцейнага заводу па вул. Варашылава арганізаваць на месцах тройкі на барацьбе з паводкай, якія падпарадкуюцца райтройкам і гарадзкой камісіі на барацьбе з паводкай.

Абавязаць тройкі пералічаных прадпрыемстваў сёе мерапрыемствы па барацьбе з паводкай і ахове прадпрыемстваў прадставіць у гарадзкі штаб да 20 сакавіка г. г.

4. Абавязаць гарадзкую камісію на барацьбе з паводкай і раённыя тройкі зараз-жа распачаць работу па падрыхтоўцы да барацьбы з паводкай, у прыватнасьці: да 20 сакавіка прынесьці ў ноўную спраўнасьць лодкі, набыць неабходныя інструманты (багры, драбіны, вяроўкі і г. д.), правесьці канкрэтныя мерапрыемствы па ўмацаваньні і ахове мастоў, прадпрыемстваў, камунальнай складаў, якія знаходзяцца ў затапляемай зоне, вызначыўшы на кожнаму абэкту адказных асоб. Разам з гэтым намеціць рад канкрэтных мерапрыемстваў па ахове дзяржаўнай маемасьці ў час паводкі.

5. Гарадзкой камісіі па барацьбе з паводкай і райтройкам устанавіць систэматычны нагляд за падняцьцем вады і пры набліжэньні пагражаючага становішча прапрадзіць жыхароў і прыняць меры да перасяленьня іх з затапляемай зоны.

6. Абавязаць усе прадпрыемствы і ўстановы (пад адказнасьць кіраўнікоў), якія знаходзяцца ў раёне затапляемай зоны, неадкладна прыняць усе меры да аховы матар'ялаў, абсталяваньня і інш.; уладжаць адказнасьць на нам. дзяжтароў прадпрыемстваў за захаваньне заводкай маемасьці, падрыхтаваць неабходныя пылады для барацьбы з паводкай і забясьпечыць бесьперабойную работу сваіх прадпрыемстваў у час паводкі, устанавіўшы сувязь з райтройкамі.

7. Абавязаць усе дамаўладальнікі (пад адказнасьць загалчыкаў дамоў, камэндантаў і прыватных дамаўласьнікаў) у часе таяньня сьнегу забясьпечыць вольны пропуск сточнай вады ў канавах, стоках, шляхам расклёпі лёду і прачыстцы рыштоў — каб папярэдзіць затапленьне падвалаў і памяшканьняў.

8. Абавязаць усіх кіраўнікоў транспарту і прыватных асоб, маючых транспартныя сродкі і іншыя прылады, якія могуць быць скарыстаны для барацьбы з паводкай, бясспрэчна перадаваць іх у распараджэньне гарадзкога штабу на барацьбе з паводкай.

9. Абавязаць Менбуд (пад адказнасьць тав. Якушка) да 23 сакавіка арганізаваць 2 будаўнічыя каманды, забясьпечыць іх належнай колькасьцю неабходных матар'ялаў, інструментаў і прылад (лес, цьвікі, вяроўкі, багры, мяшкі і інш.) й пралетарыць іх у распараджэньне гарштабу.

10. Абавязаць дарпрэдпрыцыю (пад адказнасьць тав. Шарэца) да 25-га сакавіка г. г. праверыць становішча усіх мастоў Менрайну, правесьці інструктаваньне вясковых трэк на барацьбе з паводкай, устаналіўшы усе мерапрыемствы вясковых трэк з гарадзкой камісіяй на барацьбе з паводкай.

11. Абавязаць начальніка пажарнай аховы т. Казачэнка да 20 сакавіка г. г. разам з гарадзкім саветам фізкультуры арганізаваць яд менш 15 камандаў лодачнікаў для пераправы пераправамі і аказаньня дапамогі.

Усе прадпрыемствы і ўстановы на запатрабаваньні нач. пажарнай аховы гораду павінны бясспрэчна аказваць дружынникаў добраахвотных пажарных дружын ад работы і накіраваць іх у распараджэньне тав. Казачэнка. Выплата пэнсіі дружынникам за час, патрачаны на барацьбу з паводкай, робіцца прадпрыемствамі і ўстановай па месцы працы дружынніку.

12. Абавязаць Гарснаб (пад адказнасьць т. Гантмана) падрыхтаваць пытаньне аб забясьпячэньні грамадзкім харчаваньнем асоб, выцярпеўшых ад паводкі.

13. Абавязаць усе ўстановы, прадпрыемствы і прыватных жыхароў зрабіць 3-х дзённы запас вады для сваіх патрэб на падняцьце заменьнем вадапаводнай станцыі.

14. Абавязаць інспэктуру аховы здароўя (пад адказнасьць тав. Нейштадта) да 25 сакавіка г. г. арганізаваць пры райтройках і іншых месцах медпункты для аказаньня першай дапамогі.

15. Абавязаць нафтаклад і Гарбакон (пад адказнасьць кіраўнікоў) да 25 сакавіка г. г. зрабіць у крамах 3-хдзённы запас газы.

16. Абавязаць Саюзмуку (пад адказнасьць кіраўніка) да 23 сакавіка г. г. прывесьці ў ноўную спраўнасьць мосты млыну імя Дзяржынскага, умацаваць яго згодна прапаноў камісіі па агляду месту, забясьпечыць бесьперабойную работу млыну ў час паводкі, свячасова забясьпечыць мукой хлебазавод.

Хлебазаводу наладзіць бесьперабойную выпечку хлеба ў час паводкі і яго развозку ў крамы.

17. Абавязаць сельсаветы Кіраўлянскі, Прыгарадны, Бараўскі і Н.-Двор скі да 18 сакавіка г. г. арганізаваць тройкі (пры сельсаветах) на барацьбе з паводкай, устанавіць дзяжурствы на ахове мастоў, пераправ і іншых набудоў у сваім сельсавеце.

Абавязаць усе сельсаветы безаплатна ўбраць сена, апал, лесаматар'ял і інш. маемасьць, якая знаходзіцца ў затапляемых месцах; на час паводкі ўстанавіць у сельсаветах крутласутачнае дзяжурства аказаных работнікоў для сувязі (па тэлефону) з гарадзкой камісіяй на барацьбе з паводкай.

18. Усе распараджэньні штабу на пытаньні барацьбы з паводкай зьяўляюцца абавязковымі да выкананьня ўсімі ўстановамі, прадпрыемствамі і насельніцтвам гораду Менску і раёну.

19. Вінаватыя ў парушэньні гэтай абавязковай пастановы падлягаюць штрафу да 100 руб., або прымусовай працы да 15 дзён.

20. Нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ўскладзьці на гарадзкую камісію на барацьбе з паводкай, райтройкі і міліцыю.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету ВАЛОДЗЬКА.

В. а. сакратара Менскага Гарадзкога Савету ЯГОЎДЗІН.

Мінск, друкарня «Зьвязды»

Галоўлітбел № 337.